поколений на их примере – то, что обязательно должно иметь место в нашем обществе. «Шурави», как называли советских солдат и офицеров афганцы, это заслужили своим потом и кровью, а некоторые – своей жизнью.

### Литература


1. *Ляховский А. А.* Трагедия и доблесть Афгана. М., 1995. Интернет-адрес: http://www.rsva.ru/biblio/prose_af/afgan_tragedy_and_glory/index.shtml.
2. *Громов Б. В.* Ограниченный контингент. М., 1994. Интернет-адрес: http://www.rsva.ru/biblio/prose_af/limited_contingent/5.shtml.
3. *Рунов В. А.* Афганская война. Боевые операции. М., 2008.
4. *Степаков В. И.* Спецназ России. Энциклопедия. М., 2007.
5. *Пономарёв И. А.* Во имя высокой цели: рассказывают воины, с честью выполнившие свой интернациональный долг на земле Афганистана. Л., 1988.


## КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ШТОДЗЁННАСЦІ Г. МІНСКА 20-Х ГГ. ХХСТ.


**Т. Ул. Міpановіч**


Пры дастатковай распрацаванасці гісторыі штодзённасці ў сусветнай гістарыяграфіі, дадзены накірунак у Беларусі застаецца маладаследаваным. Для беларускіх даследчыкаў характэрна распрацоўка толькі асобных тэм і праблем штодзёнасці [1, с.3], акрамя гэтага няма распрацаванай метадалогіі вывучэння гісторыі паўсядзённасці. Комплекснага даследавання паўсядзённасці Мінска міжваеннага перыяду, і 1920- х гг. у прыватнасці, да сённяшняга моманту праведзена не было, без чаго ўяўленне аб мінулым сталіцы, і краіны ў цэлым, застаецца няпоўным. Адсюль недастатковае разуменне праблем і працэсаў ў сучасным грамадстве, бо ў гэты час складваецца аснова сучаснай айчыннай культуры. Таму гісторыя штодзёнасці з'яўляецца перспектыўным навуковым накірункам, а пазбаўленне ад ідэалагічнага кантэксту гісторыі дасць магчымасць па-новаму глядзець на вядомыя факты.

Існуе два асноўных падыходы да разумення гісторыі штодзённасці. Французская школа разглядае гісторыю штодзённасці ў якасці метаду, які дазваляе атрымаць татальнае даследаванне пэўнага гістарычнага перыяду, ўсебакова вывучыць матэрыяльныя і нематэрыяльныя бакі жыцця [2, с.18], сфарміраваць мадэль «духу часу» пэўнага перыяду. Іншае разуменне гісторыі штодзённасці пераважае ў германскай (заходнегерманскай па Ул. Кошалеву), скандынаўскай і італьянскай гістарыяграфіі. У дадзеным падыходзе мяняецца аб'ект даследавання.

Гісторыкаў штодзённасці будзе цікаваць на татальнае даследаванне грамадства той ці іншай эпохі, а жыццё звычайнага, т. зв. «маленькага» чалавека.

Гісторыя штодзённасці патрабуе сур'ёзнай працы з крыніцамі. З той прычыны, што маленькі чалавек амаль не пакінуў пасля сябе звыклых для даследчыка пісьмовых крыніц, а засталіся толькі рэшткі. Неабходна арганізаваць пошук новых крыніц, а таксама адпрацоўку метадаў і прыёмаў работы з імі. Акрамя гэтага, неабходна перагледзіць ужо вядомыя крыніцы і вылучыць новыя спосабы інтэрпрэтацыі іх [3, с.75].

Як слушна заўважыла даследчык Сідоранка В.М., сучасная беларуская гістарыяграфія толькі становіцца на шлях сур'ёзных даследаванняў гісторыі штодзённасці. Важнай задачай застаецца выяўленне крыніц, іх публікацыя і крыніцазнаўчы аналіз [4, с.50]. Даследчык Сідоранка В. сярод крыніц, якія варта выкарыстоўваць для рэканструкцыі і вывучэння гісторыі штодзённасці насельніцтва Беларусі ў міжваенны перыяд вылучае наступныя: лісты грамадзян; перыядычныя выданні; справаздачы устаноў і дакладныя запіскі; успаміны і дзённікі; загады і распараджэнні; кінафотадакументы. На нашу думку прапанаваны спіс не дастаткова сістэматызаваны і з'яўляецца няпоўным. Выкарыстанне толькі абазначаных крыніц не зможа акрэсліць усю разнастайнасць паўсядзённасці.

Прапануем наступную класіфікацыю крыніц па даследаванню гісторыі штодзённасці беларускага горада 1920-х гг. Дадзены спіс састаўлены на падставе даследавання матэрыяльнай гісторыі Мінска 1920-х гг.:

1. Рэчавыя крыніцы.
2. Моўныя крыніцы (помнікі вуснай творчасці, песні, прымаўкі, байкі).
3. Дакументальныя пісьмовыя крыніцы:
   - дакументы заканадаўства;
   - актавыя дакументы;
   - матэрыялы справаводства;
   - статыстычныя матэрыялы.
4. Апавядальныя крыніцы:
   - мемуарная літаратура;
   - эпісталярныя крыніцы;
   - мастацкая літаратура;
   - публіцыстычныя творы.
5. Перыядычны друк.
6. Гістарычныя, краязнаўчыя дапаможнікі, апісанні сучаснікаў.

7. Фота-кінадакументы.

8. Выяўленчыя крыніцы (мастацка-выяўленчыя, выяўленча-графічныя).

У якасці рэчавых крыніц могуць выступаць будынкі, узведзеныя ў 1920-я гг, інтэр'еры, рэчы хатняга ўжытку, адзенне і інш. Крыніцы па штодзённай гісторыі Мінска 1920-х гг. будуць знаходзіцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь і прыватных зборах. На сучасным этапе існуюць цяжкасці ў асвятленні тэмы гісторыі матэрыяльнай культуры 1920-х гг., напрыклад мэблі, бо пераважная частка гарадской мэблі першай паловы ХХ ст. не захавалася, а музейныя зборы захоўваюць найбольш каштоўную, раскошную мэблю, якая не магла з'яўляцца тыповай для большасці насельніцтва Менска 1920-х гг.

Моўныя крыніцы прадстаўляюць сабой помнікі вуснай творчасці, песні, прымаўкі, байкі і г.д. Даследаваннем фальклору рабочых займаўся М.Я. Грынблат, матэрыялы па тэме можна знайсці ў выданнях беларускага фальклору савецкага часу.

Кінафотафонадакументы дазваляюць візуалізаваць гісторыю. Для даследавання гэтых крыніц, у першую чаргу, неабходна звяртацца да фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў.

Перыядычныя выданні цікавы для даследавання паўсядзённасці разнастайнасцю інфармацыйнага патэнцыялу, комплексным характарам звестак. Газетныя артыкулы нясуць аператыўнасць гістарычных фактаў, гэта дазваляе зразумець логіку падзей з іх эмацыйнай насычанасцю [5, с.263]. Важнай асаблівасцю з'яўляецца тое, што ў іх можна знайсці рэшткі вуснай гісторыі, так мовіць, «жывой слова» таго часу. Найбольш карыснымі для даследавання паўсядзённасці Мінска 1920-х гг. неабходна назваць дзве газеты «Звязда» і «Савецкая Беларусь». Гэтыя выданні на сваіх старонках змяшчаюць пастановы, асобныя артыкулы аб жыллёвым становішчы Мінска, акрамя таго, мастацкае слова, абвесткі, рэкламу і іш. Варта звярнуць ўвагу на выданні «Чырвоная Змена», «Полымя», «Асьвета», «Бальшавік Беларусі», «Звезда молодежи», часопіс «Прафесійны рух Беларусі», «Сацыялістычнае Будаўніцтва», «Чырвоная краіна». Асобнай групай можна разглядаць выданні, якія выдаваліся нацыянальнымі меншасцямі ў Мінску: «Акцябр» на яўрэйскай мове, асвятляе гаспадарчае і культурнае жыццё ў сталіцы, змены ў побыце яўрэйскага насельніцтва; «Звязда Моладзі» (GWIAZDA MŁODZIEŻY) зарыентаванае на польскую моладзь; карыснымі будуць звесткі спецыялізаванага выдання «Беларуская медычная думка». У ім асвятляліся пытанні аховы здароўя, развіцця лячэбнай сеткі, стане

санітарыі, гігіены, распаўсюджанасці захворванняў, хронікі медыцынскага жыцця. Часопіс надаваў значную ўвагу стану, распаўсюджанасці прастытуцыі, а таксама прафілактыцы і барацьбы з гэтай сацыяльнай з’явай.

На жаль, мала даследаванымі застаюцца крыніцы, так званага асабістага паходжання – мемуарная літаратура, эпісталярныя крыніцы. Грамадскія падзеі ў іх паказаны не ўвогуле, а ў сувязі з гэтай асобай, праз яе суб'ектыўнае ўспрыманне. Іх аналіз дазволіў бы ўбачыць малюнак штодзённага жыцця вачыма сучасніка. Гэтая група крыніц можа даць важную інфармацыю аб жыцці ў першую чаргу інтэлігенцыі. Сярод надрукаваны крыніц асабістага паходжання можна назваць успаміны Ф. Дана, успаміны аб Мінску В. Ластоўскага, мастака Я.М. Ціхановіча, А. Саковіч (І. Рытар), невядомага сучасніка (мянушка «Мінскі мужык»), М. Улашчыка, В.М. Бугаенка, Д.Фішмана. Акрамя таго неабходна звяртацца да фондаў архіва Саюзу Беларускіх Пісьменнікаў і Беларускага Дзяржаўнага Архіва-Музея Літаратуры і Мастацтва.

Існуе велізарная колькасць матэрыялаў эпісталярнага характару перыяду XX ст.. У савецкі час істотнае распаўсюджванне атрымаў такі эпісталярны жанр, як пісьмы ў савецкія ўстановы і газеты, але значная колькасць іх не захавалася [6, с.152]. Частка эпісталярных дакументаў знаходзіцца ў фондах Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці. Група дакументальных крыніц дастаткова распрацавана, неаднаразова выдавалася, але патрабуе перагляду і выяўленню неапрацаваных дакументаў. Пераважная колькасць крыніц змешчана ў фондах Нацыянальнага архіва РБ і Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці.

Літаратурныя і публіцыстычныя творы маюць першаступеннае значэнне для вывучэння гісторыі культуры і ідэалогіі. Яны з’яўляюцца цікавай для гістарычнай навукі крыніцай узнаўлення сацыяльна-палітычнай карціны часу [6, с.143]. Нас будуць цікавіць творы сяброў літаратурных аб’яднанняў што былі шырока распаўсюджаны ў гэты час (Узвышша, Полымя, Звенья і інш.), класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага і г.д. Цікавае апісанне Мінска знаходзім ў творы «Деревянный ключ» А. Лежнева.

Гістарычныя, краязнаўчыя дапаможнікі, апісанні сучаснікаў даюць магчымасць больш эфектыўна арыентавацца ў прасторы Мінска абазначанага часу. Асобнага вывучэння патрабуюць выяўленчыя крыніцы, да якіх можна аднесці карціны, плакаты, мапы, планы і г.д. Яны могуць стаць цікавым дапаможнікам ў візуалізацыі 1920-х гг.

## Літаратура

1. *Кашталян І. С.* Штодзённае жыццё беларускага грамадства (1944–1953). Аўтарэф. дысерт на суісканне вучонай ступені кандыдата гіст. навук. Мн., 2006. 20 с.
2. *Кошелев В.* Первоисточники о повседневной жизни и права человека как учебная цель // Гісторыя штодзённасці і правы чалавека. Мат.міжнар. канф.1–5.12 1999 г., Мінск. Мн: Тэхналогія, 2000. С. 17–30.
3. *Пандель Г. Ю.* Повседневная история как новый жанр историографии // Гісторыя штодзённасці і правы чалавека. Мат.міжнар. канф. 1–5.12.1999 г. Мінск. Мн: Тэхналогія, 2000. С. 73–87
4. *Сідоранка В. М.* Крыніцы па гісторыі паўсядзённасці насельніцтва Беларусі 1918–1939 // Традыцыя матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў пастчарнобыльскі час: зб. навук. арт./ Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. 431 с. С. 49–52.
5. *Вирская В. П.* Интеллегенцыя Минска в публикациях 1920-х годов. // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада): мат. міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 7–9 верас. 2007 г.) / рэдкал.: А.А. Каваленя. Мн.: Беларус. Навука, 2008. 400 с. С.263–270
6. *Ходзін С. М.* Крыніцы гісторыі Беларусі (спроба гісторыка-генетычнага і кампаратыўнага вывучэння). Мн: БДУ, 1999. 194 с.


# ДВИЖЕНИЕ ИСТОРИЧЕСКОЙ РЕКОНСТРУКЦИИ В США


**Д. В. Морозов**


В настоящее время историческая реконструкция является популярным хобби для сотен тысяч людей по всему миру. В разных странах преобладают различные направления данного многообразного движения, в зависимости от исторического прошлого страны и общего культурного развития общества.

Историческая реконструкция (далее ИР) – это процесс, направленный на воссоздание предметов и их комплексов, а также культурных моделей (обряды, праздники) старины. Реконструирование той или иной исторической эпохи подразумевает под собой воссоздание одежды, вещей, бытовой утвари, оружия, доспехов, украшений и т.д. на основе научных данных с соблюдением исторических технологий и использованием материалов, аналогичных материалам реконструируемой эпохи [1].

Несколько десятилетий назад тема ИР стала объектом интереса американской научной общественности. Так, например, информация о музеях живой истории и привлечении к их деятельности реконструкторов содержится Скотта Мэгильссена «Живые музеи» [2]. История реконструкции периода Гражданской войны в США хорошо изложена в работе Роберта Ли Хаддена «Возрождая Гражданскую